НАРОДНАЕ
АПЫТАННЕ

Травень 2023

# КАШТОЎНАСЦІ І ЦЯРПІМАСЦЬ ПРАТЭСНЫХ БЕЛАРУСАЎ



**Беларусаў, якія падтрымліваюць дэмакратычныя сілы, часта называюць ліберальнымі і дэмакратычнымі. Мы вырашылі высветліць, наколькі талерантныя беларусы, ці лічаць сябе дэмакратамі і чаго ў першую чаргу чакаюць ад уладаў.**

## Большасць лічаць сябе дэмакратамі і не гатовыя жыць па суседству з прыхільнікамі рэжыма

Сярод апытаных 96% назвалі сябе людзьмі дэмакратычных перакананняў. 73% апытаных выступаюць за прынцыцё рашэнняў ў дзяржаве шляхам прамой дэмакратыі, а палова аддае перавагу прадстаўнічай дэмакратыі. Яшчэ траціна лічуць, што рашэнні павінны прымаць эксперты ў адпаведных галінах. Цікава, што сярод рэспандэнтаў, якія абралі анкету на беларускай мове, доля тых, хто называе сябе дэмакратамі, вышэй за тых, хто адказваў на анкету на рускай мове. Што менавіта апытаныя маюць на ўвазе пад дэмакратычнымі перакананнямі, застаецца пытаннем для далейшых даследаванняў.

### Ці можаце Вы сябе назваць чалавекам дэмакратычных перакананняў?

Агулам у Беларусі. Колькасць рэспандэнтаў - 1140




1 У апытанні прынялі ўдзел 1140 чалавек, якія на дадзены момант пражываюць у Беларусі. 65% апытаных пражываюць у Мінску ці Мінскай вобласці. 53% рэспандэнтаў - мужчыны, 47 - жанчыны. Больш пра метадалогію ініцыятывы Народнае апытанне чытаць тут.

## Адзначце ўсе сцвярджэнні пра прыняцце рашэнняў у дзяржаве, з якімі Вы згодны:

Агулам у Беларусі. Колькасць рэспандэнтаў - 1140




Мы паглядзелі на некаторыя трэнды звязаныя з цярпімасцю і ліберальнасцю прастэсных беларусаў. Так, напрыклад, мы запыталі, з кім беларусы не гатовыя жыць па суседству. Найбольш часта рэспандэнты абіралі людзей з алка- ці нарказалежнасцю. Акрамя таго, амаль 70% апытаных не хацелі б жыць па суседству з прыхільнікамі рэжыма Лукашэнкі. Адна пятая рэспандэнтаў не хацелі б жыць побач з аднаполымі парамі.

## Калі б Вы абіралі суседзяў, з кім бы Вы дакладна НЕ хацелі жыць побач:

Агулам у Беларусі. Колькасць рэспандэнтаў - 1140



## Супраць смяротнага пакарання і за захванне права на аборт

Большасць пратэсных беларусаў лічаць, што правa жанчын на аборт не павінна абмяжоўвацца дзяржавай. Так, 45% выступаюць за дазвол абортаў ва ўсіх выпадках, а 34% – у большасці. Раней пратэсныя беларусы таксама былі адной з найбольш ліберальных групаў па пытанні права на аборт. Напрыклад, у апытанні Chatham House ад 2020 году сярод 75%, што выказалі думку, што аборты павінны быць дазволеныя ва ўсіх ці ў большасці выпадкаў, большасць належылі да группы беларускіх гараджан, якія падтрымліваюць пратэст.

**Што Вы думаеце аб дзяржаўным рэгуляванні права на аборт?**

Агулам у Беларусі. Колькасць рэспандэнтаў - 1142




Цікава, што думка пратэсных беларусаў па смяротным пакаранні адрозніваецца ад меркавання грамадства агулам. Калі у 2020 годзе 56% беларускіх гараджан выказаліся за захаванне смяротнага пакарання. Прыхільнікі пратэсту катэгарычна не падтрымліваюць захаванне смяротнага пакарання (85%).

**Як Вы ставіцеся да смяротнага пакарання як найвышэйшай меры пакарання ў Беларусі?**

Агулам у Беларусі. Колькасць рэспандэнтаў - 1142




## Неаднназначнае стаўленне да дэкрыміналізацыі лёгкіх наркотыкаў і да аднаполых шлюбаў

Меркаванне пратэсных беларусаў аб адмене крымінальнай адказнасці за ўжыванне лёгкіх наркотыкаў падзяліліся. Так, 41% апытаных супраць такой прапановы, а 49% – за. У падобным апытанні Chatham House, 83% жыхароў беларускіх гарадоў выказваліся за захаванне крымінальнай адказнасці за ўжыванне канопляў. Гэта можа сведчыць пра тое, што пратэсныя беларусы маюць больш гнуткія і ліберальныя погляды.

Падобны падзел у меркаваннях заўважны і па пытанні легалізацыі аднаполых шлюбаў. 44% выступаюць супраць аднаполых шлюбаў, а 45% – цалкам ці часткова падтрымліваць легалізацыю.

## Як Вы ставіцеся да ідэі дэкрыміналізацыі (адмены крымінальнай адказнасці) лёгкіх наркотыкаў?

Агулам у Беларусі. Колькасць рэспандэнтаў - 1142




## Як Вы ставіцеся да ідэі ўзаконьвання (легалізацыі) аднаполых шлюбаў?

Агулам у Беларусі. Колькасць рэспандэнтаў - 1141



## Бачаць ролю дзяржавы ў забеспячэнні палітычнага ўдзелу і эканамічнага дабрабыту

Найбольш важнай функцыяй дзяржавы апытаныя лічаць забеспячэнне палітычнага ўдзелу грамадзян (47%) і абарону свабоды слова (27%). Пры гэтым найбольш важным кампанентам у жыцці грамадзян апытаныя бачаць высокі ўзровень эканамічнага развіцця (54%). На другім месцы большасць рэспандэнтаў абралі свабоду выказванняў у публічнай прасторы.

### Што з ніжэйпералічанага здаецца Вам найбольш важнай функцыяй дзяржавы?

Агулам у Беларусі. Колькасць рэспандэнтаў - 1140



## Які з ніжэйпрыведзеных кампанентаў у жыцці грамадзян Беларусі Вам здаецца найбольш важным у будучыні краіны ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ?

Агулам у Беларусі. Колькасць рэспандэнтаў - 1140




## Які з ніжэйпрыведзеных кампанентаў у жыцці грамадзян Беларусі Вам здаецца найбольш важным у будучыні краіны ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ?

Запаўненне анкеты на беларускай мове. Колькасць рэспандэнтаў - 742



## Які з ніжэйпрыведзеных кампанентаў у жыцці грамадзян Беларусі Вам здаецца найбольш важным у будучыні краіны ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ?

Заполнение анкеты на русском языке. Колькасць рэспандэнтаў - 617




## Які з ніжэйпрыведзеных кампанентаў у жыцці грамадзян Беларусі Вам здаецца найбольш важным у будучыні краіны ў ДРУГУЮ ЧАРГУ?

Агулам у Беларусі. Колькасць рэспандэнтаў - 1140



Большасць апытаных лічуць, што дзяржава ў першую чаргу не павінна абмяжоўваць магчымасці грамадзян для самарэалізацыі. Заўважна большая частка беларускамоўных апанентаў выказаліся за тое, што дзяржава павінна ў першую чаргу падтрымліваць сацыльна незабяспечаныя сем'і (72% у параўнанні з 42% рускамоўных рэспандэнтаў). Цікава, што амаль палова рэспандэнтаў выказваюцца супраць высокіх падаткаў для грамадзян, якія зарабляюць больш сярэдняга.

## Адзначце ўсе сцвярджэнні пра ролю дзяржавы ў жыцці людзей, з якімі Вы згодны:

Агулам у Беларусі. Колькасць рэспандэнтаў - 1141




## Адзначце ўсе сцвярджэнні пра ролю дзяржавы ў жыцці людзей, з якімі Вы згодны:

Запаўненне анкеты на беларускай мове. Колькасць рэспандэнтаў - 742



### Адзначце ўсе сцвярджэнні пра ролю дзяржавы ў жыцці людзей, з якімі Вы згодны:

Заполнение анкеты на русском языке. Колькасць рэспандэнтаў - 618




## Галоўныя каштоўнасці - свабода і бяспека

Для большасці апытаных найбольшай каштоўнасцю з'яўляецца свабода і бяспека. Роўнасць як каштоўнасць абралі найменшая колькасць рэспандэнтаў. Таксама мы запыталі, наколькі шчаслівымі лічаць сябе беларусы. 13.5% хутчэй не лічаць сябе шчаслівымі, 66% называюць сябе дастаткова шчаслівымі, а 20.5% вельмі шчаслівымі.

### Большасць людзей лічаць як свабоду, так і роўнасць важнымі, але калі б Вас папрасілі абраць, што для Вас больш прыярытэтна?

Агулам у Беларусі. Колькасць рэспандэнтаў - 1140



## Большасць людзей лічаць як свабоду, так і бяспеку важнымі, але калі б Вас папрасілі абраць, што для Вас больш прыярытэтна?

Агулам у Беларусі. Колькасць рэспандэнтаў - 1139




## Большасць людзей лічаць як роўнасць, так і бяспеку важнымі, але калі б Вас папрасілі абраць, што для Вас больш прыярытэтна?

Агулам у Беларусі. Колькасць рэспандэнтаў - 1139



## Наколькі шчаслівым чалавекам Вы лічыце сябе?

Агулам у Беларусі. Колькасць рэспандэнтаў - 1140



Народнае апытанне — незалежны праект па вывучэнню грамадзкага меркавання ў Беларусі.

https://narodny-opros.net

Цэнтр новых ідэй — аналітычны цэнтр, дзейнасць якога прысвечаная магчымасцям развіцця і адказам на выклікі, якія стаяць перад Беларуссю ў XXI стагоддзі. Наша місія ў тым, каб дапамагчы палітычным і грамадскім арганізацыям пабудаваць больш адкрытую, заможную і ўстойлівую Беларусь.

https://www.newbelarus.vision

Фота: Павел Крычко

Травень 2023